*УДК 81'42*

# ПРОПИСНАЯ И СТРОЧНАЯ БУКВЫ КАК СРЕДСТВА РЕАЛИЗАЦИИ ПРАГМАТИЧЕСКОГО ПОТЕНЦИАЛА ХУДОЖЕСТВЕННОГО ПРОЗАИЧЕСКОГО ТЕКСТА

***О. Н. ШЕРШНЁВА***[1)]

[1)]*Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, ул. Космонавтов, 1, 212022, г. Могилёв, Беларусь*

Рассматриваются и последовательно описываются прагматические значения прописной и строчной букв в художественном прозаическом тексте, а именно прагматические значения отдельных слов, написанных с прописной буквы; слов, написанных прописными буквами; словосочетаний и предложений, написанных прописными буквами; ненормативного использования строчной буквы вместо прописной. Утверждается, что имплицитные значения отдельных позиций такого употребления могут иметь одинаковый или сходный прагматический потенциал, однако каждая из отмеченных позиций отличается своей ролью как дополнительного средства передачи мыслей и чувств, структурно-композиционной организации произведения, выражения перспективно-ретроспективных отношений. Делаются выводы о том, что субъективное восприятие прагматического богатства индивидуального употребления прописной и строчной букв мотивирует писателя отходить от общепринятых правил, однако авторский подход заключается не в нарушении норм орфографической системы, не в игнорировании традиционных значений отдельных букв, а в усилении их роли как дополнительных средств передачи мыслей и чувств в художественном тексте, расширении границ их употребления.

***Ключевые слова:*** прагматический потенциал; прагматические функции; прагматические значения; художественный текст; прозаический текст; прописная буква; строчная буква.

# ВЯЛІКАЯ І МАЛАЯ ЛІТАРЫ ЯК СРОДКІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГМАТЫЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ МАСТАЦКАГА ПРАЗАІЧНАГА ТЭКСТУ

***В. М. ШАРШНЁВА***[1*]

[1*]*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, вул. Касманаўтаў, 1, 212022, г. Магілёў, Беларусь*

Разглядаюцца і паслядоўна апісваюцца прагматычныя значэнні вялікай і малой літар у мастацкім празаічным тэксце, а менавіта прагматычныя значэнні асобных слоў, напісаных з вялікай літары; слоў, напісаных вялікімі літарамі; словазлучэнняў і сказаў, напісаных вялікімі літарамі; ненарматыўнага выкарыстання малой літары замест вялікай. Сцвярджаецца, што імпліцытныя значэнні асобных пазіцый такога ўжывання могуць мець аднолькавы або блізкі прагматычны патэнцыял, аднак кожная з адзначаных пазіцый вылучаецца сваёй роллю ў якасці дадатковага сродку перадачы думак і пачуццяў, структурна-кампазіцыйнай арганізацыі твора, выражэння перспектыўна-рэтраспектыўных

**Образец цитирования:**
Шаршнёва ВМ. Вялікая і малая літары як сродкі рэалізацыі прагматычнага патэнцыялу мастацкага празаічнага тэксту. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2024;1:51–60.
EDN: MSSNKL

**For citation:**
Sharshniova VM. Capital and lowercase letters as a means of implementing the pragmatic potential of literary prose text. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2024;1:51–60. Belarusian.
EDN: MSSNKL

**Автор:**
***Ольга Николаевна Шершнёва*** – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры славянской филологии историко-филологического факультета.

**Author:**
***Volha M. Sharshniova***, PhD (philology), docent; associate professor at the department of Slavic philology, faculty of history and philology.
*shershnyova@msu.by*

CC BY NC

адносін. Робяцца высновы адносна таго, што суб'ектыўнае ўспрыманне прагматычнай насычанасці асобнага выкарыстання вялікай і малой літар матывуе пісьменніка адхіляцца ад агульнапрынятых правіл, аднак аўтарская індывідуальнасць заключаецца не ў парушэнні арфаграфічнай сістэмы, не ў ігнараванні традыцыйных значэнняў пэўных літар, а ва ўзмацненні іх ролі як дадатковых сродкаў перадачы думак і пачуццяў у мастацкім тэксце, пашырэнні меж іх выкарыстання.

***Ключавыя словы:*** прагматычны патэнцыял; прагматычныя функцыі; прагматычныя значэнні; мастацкі тэкст; празаічны тэкст; вялікая літара; малая літара.

# CAPITAL AND LOWERCASE LETTERS AS A MEANS OF IMPLEMENTING THE PRAGMATIC POTENTIAL OF LITERARY PROSE TEXT

***V. M. SHARSHNIOVA***[a]

[a]*Mogilev State A. A. Kuleshov University,*
*1 Kasmanawtaw Street, Magiliow 212022, Belarus*

The article examines and consistently describes the pragmatic meanings of capital and lowercase letters in literary prose text, namely the pragmatic meanings of individual words written with a capital letter; words written in capital letters; phrases and sentences written in capital letters; improper use of a lowercase letter instead of a capital one. It is argued that the implicit meanings of individual positions of such use may have the same or similar pragmatic potential, however, each of the noted positions is distinguished by its role as an additional means of transmitting thoughts and feelings, as an element of the structural and compositional organisation of the work, as a means of expressing perspective-retrospective relationships. It is concluded that the subjective perception of the pragmatic richness of the individual use of capital and lowercase letters motivates the writer to deviate from generally accepted rules, however, the author's individuality does not lie in violating the norms of the spelling system, not in ignoring the traditional meanings of individual letters, but in strengthening their meaning as additional means transmission of thoughts and feelings in a literary text, in expanding the boundaries of their use.

***Keywords:*** pragmatic potential; pragmatic functions; pragmatic meanings; literary text; prose text; capital letter; lowercase letter.

## Уводзіны

Мова сучаснай беларускай прозы ў пошуку новых сродкаў выразнасці запазычвае арыгінальныя прыёмы з розных сфер жыцця. Стыль мастацкага тэксту адлюстроўваецца ў спецыфічнай заканамернасці аб'яднаных моўных рэсурсаў, выкарыстаных пісьменнікам у адпаведнасці з уласнай задумай. У выяўленні ўплыву моўных і маўленчых сродкаў выразнасці на станаўленне аўтарскага ідыястылю значную ролю адыгрывае графічнае афармленне літаратурна-мастацкага твора. У сучасных мастацкіх творах назіраецца тэндэнцыя да пашырэння знакавай сістэмы празаічнага маўлення, адзначаецца павелічэнне колькасці магчымых функцый, якія прымаюць на сябе розныя знакі ў празаічным тэксце. Арыгінальна выкарыстаныя традыцыйныя графічныя сродкі, а таксама адступленні ад графічнай нормы набываюць новы сэнс і становяцца раўнапраўнымі элементамі выказвання.

У тэкстах найноўшай беларускай прозы (канец XX – пачатак XXI ст.) актуалізуюцца тэндэнцыі нерэгламентаванага (нестандартнага) выкарыстання розных прыёмаў, заснаваных на графічнай сістэме пісьмовай мовы, што дае права даследаваць графіку з пункту гледжання камунікатыўна-прагматычнага падыходу як эфектыўны фактар моўнай камунікацыі.

Успрымаючы графіку не як адметны моўны ўзровень, а як спецыфічны код, І. У. Арнольд асэнсоўвала яе як «асобую сістэму знакаў і правіл іх ужывання, прызначаную для захавання і перадачы вербальнага паведамлення ў выглядзе, прыдатным для зрокавага ўспрымання»[1] [1, с. 14]. Яна сцвярджала, што «звычайна графічныя сродкі накіраваны на перадачу эмацыянальнай афарбоўкі, гэта значыць пачуццяў, якія пісьменнік паведамляе чытачу, або эмфазы як агульнага спецыяльнага павелічэння намаганняў таго, хто гаворыць, якое асабліва падкрэслівае частку выказвання ці падказвае наяўнасць падтэксту» [1, с. 14].

Для сістэмнага апісання графіка-пунктуацыйнай індывідуальнасці аўтараў сучаснай прозы дарэчным бачыцца выкарыстанне паняцця «графон». Яно тлумачыцца як «...фігура маўлення, якая заключаецца

[1]Тут і далей пераклад наш. – *В. Ш.*

ў наўмысным і прагматычна матываваным адхіленні ад нарматыўнага графічнага і/або арфаграфічнага аблічча слова для дасягнення якога-небудзь стылістычнага эфекту. Сродкамі рэалізацыі гэтай фігуры (яе разнавіднасцямі) з'яўляюцца шрыфтавыя вылучэнні, курсіў, факультатыўныя двукоссі, разрадка, дэфісацыя, увядзенне ў тэкст іншародных знакаў, напісанне вялікай літары замест малой, адхіленне ад арфаграфічнай або пунктуацыйнай нормы, фігурнае размяшчэнне тэксту на плоскасці ліста, а таксама сумяшчэнне вышэйзгаданых спосабаў у розных камбінацыях»[2].

Прагматычныя характарыстыкі мастацкага тэксту падпарадкаваны агульнай функцыянальнай накіраванасці – эстэтычнаму ўздзеянню на рэцыпіента. У сувязі з гэтым уяўляюцца каштоўнымі ўсведамленне і асэнсаванне стылістычнай нагрузкі, характэрнай для графіка-пунктуацыйнага моўнага ўзроўню. Варта пагадзіцца з І. П. Зыранавай, якая сцвярджае, што дзякуючы выкарыстанню графічных (і ў значнай ступені літарных) сродкаў аўтар «атрымлівае дадатковыя магчымасці акцэнтуацыі, падкрэслівання найбольш важных у камунікатыўных адносінах элементаў выказвання, што спрыяе мэтанакіраванаму ўздзеянню на адрасата, якое залежыць не толькі ад зместу, але і ад формы, ад арганізацыі тэксту» [2, с. 28–29].

На ўспрыманне тэксту і падтэксту любога літаратурна-мастацкага твора пэўны адбітак накладвае выкарыстанне літарнай графікі. М. І. Васільева ўказвае на змяненне функцыянальнага патэнцыялу вялікай літары і сцвярджае, што яна «шматразова ўзмацняе ўздзейны патэнцыял паведамлення: новыя сэнсы дапамагаюць знізіць крытычнасць першаснага ўспрымання інфармацыі, пабуджаюць адрасата да перажывання пэўных эмоцый»[3], а «адступленне ад правіл выкарыстоўваецца аўтарам як прыём, накіраваны на сэнсавае ўзбагачэнне тэксту»[4].

Прагматычную значнасць актуалізацыі слова пры дапамозе вялікай або малой літары падкрэслівае таксама А. І. Дунёў: «Ужыванне вялікай літары ў зонах свабоднага выбару ўказвае на інтэнцыі таго, хто піша, прыцягнуць і затрымаць увагу таго, хто чытае, вылучыць названы прадмет з шэрагу, паказаць яго індывідуальнасць» [3, с. 40].

М. І. Карповіч лічыць вялікую літару інструментам уздзеяння на адрасата, таму што яна «напаўняе паведамленне новым сэнсам» [4, с. 166], «запускае механізм адвольнай матывацыі, у выніку чаго слова прыцягвае да сябе ўвагу... пераўтвараецца ў пучок сэнсаў; дазваляе сумясціць гэтыя сэнсы ў адной абалонцы і тым самым лаканічна выразіць разгорнутую думку» [4, с. 170].

Адступленне ад нарматыўнага ўжывання вялікай або малой літары, па сутнасці, прадстаўляе сабой экспрэсіўны сродак выказвання, а менавіта з экспрэсіўнымі магчымасцямі непасрэдна звязаны і прагматычны патэнцыял, паколькі, паводле думкі В. А. Маславай, экспрэсіўнасць – гэта «інтэгральны вынік такіх планаў, як эматыўнасць, вобразнасць, ацэначнасць, інтэнсіўнасць, стылістычнае маркіраванне, структурна-кампазіцыйныя падтэкставыя з'явы» [5, с. 186].

Пры ўспрыманні мастацкага тэксту канцэптуальна важным уяўляецца асэнсаванне не толькі экспліцытнай, але і імпліцытнай інфармацыі, адзін з тыповых спосабаў прадстаўлення якой – прагматычна маркіраванае некадыфікаванае ўжыванне вялікай і малой літар. Асобнае вывучэнне прагматычнага патэнцыялу вялікай і малой літар у сучасным беларускім празаічным тэксце і сістэматызацыя іх магчымых прагматычных значэнняў не праводзіліся, у сувязі з чым актуальнасць дадзенага даследавання і ілюстрацыі матэрыялу, які яго пацвярджае, відавочная.

Навуковая навізна артыкула заключаецца ва ўстанаўленні прагматычнай накіраванасці вялікай і малой літар, сістэматызацыі іх прагматычных значэнняў у мастацкім тэксце.

Аб'ектам даследавання, якое грунтуецца на матэрыяле сучасных беларускіх мастацкіх твораў, з'яўляюцца вялікая і малая літары як сродкі актуалізацыі прагматычнага патэнцыялу празаічнага тэксту.

Мэты артыкула – апісанне і фактычнае пацвярджэнне найбольш тыповых прагматычных значэнняў і функцый вялікай і малой літар у сучасным мастацкім празаічным тэксце. Дасягненне пастаўленых мэт бачылася непасрэдна ў паслядоўным апісанні прагматычных значэнняў асобных слоў, напісаных з вялікай літары; слоў, напісаных вялікімі літарамі; словазлучэнняў і сказаў, напісаных вялікімі літарамі; ненарматыўнага выкарыстання малой літары замест вялікай.

Асноўныя метады даследавання – інтэрпрэтатыўны метад аналізу мастацкага празаічнага дыскурсу, метады кантэкстуальнага, карэляцыйнага і камунікатыўна-прагматычнага аналізу.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Камунікатыўна-прагматычны падыход да моўных адзінак актуалізуе перадачу камунікатыўна важнага для выказвання зместу. Кампаненты прагматычнага значэння грунтуюцца на ўласцівасці моўных

[2]Графон // Эффективное речевое общение (базовые компетенции) : словарь-справочник / под ред. А. П. Сковородникова. Красноярск : Изд-во Сибир. федерал. ун-та, 2014. С. 108.

[3]*Васильева М. И.* Новые функции прописной буквы в современном русском языке : автореф. дис. ... канд. филолог. наук : 10.02.01. Тверь, 2018. С. 14.

[4]Там же.

адзінак знаходзіцца ў сэнсавай узаемасувязі з іншымі моўнымі адзінкамі. Такая ўзаемасувязь стварае своеасаблівы прагматычны фон не толькі пэўнага фрагмента мастацкага тэксту, але і ўсяго твора. Успрыманне прагматычнага значэння як адносін паміж моўнымі знакамі і чалавекам [6] падказвае магчымасць выкарыстання іх зрокавых характарыстык у разуменні сэнсу.

Будуючы твор на аснове стандартных графічных знакаў, пісьменнікі з мэтай павышэння прагматычнага патэнцыялу часта ўжываюць у якасці дадатковага прыёму візуальнага вылучэння вялікую літару замест малой і наадварот. Не адмаўляючы магчымасці выканання вялікай і малой літарамі іншых прагматычных функцый, трэба заўважыць, што найбольш выразнымі для іх, акрамя экспрэсіўнай, з'яўляюцца акцэнтуацыйная, атрактыўная, кампрэсіўная і аплікатыўная функцыі.

Візуальна прываблівaючы чытача, слова (комплекс слоў), напісанае з вялікай літары, вылучаецца нават пры павярхоўным успрыманні тэксту. Акцэнтаванне наяўнасці дадатковай інфармацыі (аплікатыўная функцыя) накіравана на стымуляванне чытацкага інтарэсу (атрактыўная функцыя), задавальненне жадання чытача зразумець аўтарскія інтэнцыі. Па сутнасці, змест напісанага з вялікай літары слова (спалучэння слоў) атрымліваецца большым, чым зафіксаванае слоўнікамі значэнне гэтага слова, што лагічна накіроўвае на выразнасць кампрэсіўнай функцыі.

Акрамя традыцыйнага вылучэння ўласных назваў пры дапамозе вялікай літары, можна заўважыць некаторыя выпадкі яе спецыфічнага выкарыстання, у значнай ступені характэрныя для сучаснага празаічнага тэксту. Кожнае неўзуальнае напісанне адной ці некалькіх літар у слове, усяго слова, некалькіх слоў з'яўляецца прагматычна арыентаваным, паколькі яно прыўлівае ўвагу адрасата праз вылучэнне камунікатыўна важных элементаў мастацкага маўлення. Напісанне слова з вялікай літары можа надаваць яму наступныя прагматычныя значэнні:

• значнасць пэўнай асобы або істоты, надзвычайную павагу да яе:

*Здаецца, яшчэ ж толькі ўчора Ты была такой вясёлай і мы гаварылі адно аднаму прыгожыя, добрыя словы*[5] (Адам, с. 10);

***Не спадзяюся*** (вылучана намі. – *В. Ш.*) *вярнуцца ў маленства, маладосць.*

*А хочацца! У мроях і ўспамінах часта сустракаюся з Мамай.*

<...>

*Як жа хочацца пабываць у бацькоўскай хаце! Рыпучая брамка. Травяная сцяжынка. Ганачак, дзверы ў сенцы, дзверы ў хату. Каля печы – Мама, за сталом – Бацька* (Ліпскі-1, с. 16–18);

• тыповасць паводзін, пачуццяў:

*Ён паспрабаваў уявіць, што шугае аж да самых зорак, і ад страху аж заплюшчыў вочы. Але расплюшчыў іх і ўбачыў над сабою вяршыні бяроз і Яе, маленькую, сярод агромністых белых аблокаў. Яна кружляла і рабілася ўсё меншаю.*

*Я не магу ўзляцець, – крыкнуў Ён.*

*Але Яна, мусіць, не пачула, бо не адгукнулася* (Крэйдзіч, с. 175).

Ён і Яна тыпізуюцца і ўспрымаюцца як любыя закаханыя мужчына і жанчына;

• важнасць жыццёвай падзеі:

*Пра спатканне ў дзень першага снегу ўспомніла Света. Яна падышла да Марыны, загадкава прыжмурыла вочы і спытала:*

*– Памятаеш, які сёння дзень?*

*Марына ўважліва прыгледзелася да аднакурсніцы, напружыла думку, але нічога ўзгадаць не змагла. Тады Света шырока ўсміхнулася і радасна абвясціла:*

*– Сёння, дарагая мая, Дзень Першага Снегу, а гэта значыць, у нас з табой...*

*Яе словы перахапіла Марына, прасякнутая цудоўнай здагадкай, і дзяўчаты прамовілі ва ўнісон:*

*– Спатканне!*

*Вечарам сяброўкі накіраваліся да кінатэатра «Радзіма», на тое самае месца, дзе летась сустракаліся з хлопцамі* (Кебіч, с. 170–171);

• вялікую сілу пачуццяў і прадметаў рэчаіснасці, магчымасці жывых істот, уласнае імя:

*А праз нейкія паўгадзіны я нарэшце ўбачыў яго Вялікасць Мора* (Пятровіч-1, с. 171);

*Залатыя ніткі – для тых, каму прызначана ў свеце заняць высокае становішча, вылучыцца з масы, карыстацца прыхільнасцю Спадарыні Удачы* (Канстанцінава, с. 159);

*Аддавай. Дары. Рабі дабро. Светла жыві. І з табою заўжды штоночы будзе глядзець прыемныя сны сама пані Лагода* (Ліпскі-2, с. 34);

• характарыстыку асобы паводле яе здольнасцей:

*«Ты павінна насіць акуляры і сядзець на першай парце!» – яна і сядзела за той першай партай у нязграбных акулярах з чорнай аправай, дзяўчынка Дай-Спісаць, але зрок усё роўна працягваў падаць...* (Брава, с. 15);

[5]Тут і далей арфаграфічныя і пунктуацыйныя асаблівасці мастацкіх тэкстаў захаваны. – *В. Ш.*

• значнасць пасады асобы, пра якую вядзецца гаворка:

*– Ты такі багаты?*

*– Крэдыт. Я член праўлення банка.*

*– Такія аб'екты пад кантролем Самога.*

*– Прэзідэнта? Ён згодзіцца, калі прачытае мой праспект. Не дзеля забавы купляю – для арганізацыі вытворчасці* (Шамякін, с. 400).

Адрозненне семантыкі напісання з вялікай літары і напісання вялікімі літарамі заключаецца ў першую чаргу ў прагматычнай накіраванасці такога запісу: напісанне слова з вялікай літары засяроджвае ўвагу на стылістычнай характарыстыцы, у той час як змест слоў, напісаных вялікімі літарамі, заключаецца ва ўзмацненні іх сэнсавай нагрузкі, архітэктанічна-кампазіцыйнай важнасці. Словы (сказы, радкі), напісаныя вялікімі літарамі, успрымаюцца не толькі як эмацыянальна афарбаваныя адзінкі, але і як носьбіты дадатковага сэнсу, спецыфічныя паказальнікі наяўнасці імпліцытнай інфармацыі. Такі спосаб напісання слоў дае магчымасць успрымаць іх як ключавыя, накіроўвае на асэнсаванне і пераасэнсаванне значнасці пададзенай інфармацыі, тым больш што ўспрыманне падтэксту аказваецца не менш важным, чым разуменне ўсіх слоў, уключаных у тэкст.

Больш за тое, напісанае вялікімі літарамі слова заўсёды мае рэтраспектыўную або перспектыўную накіраванасць, якая непасрэдна звязана з успрыманнем зместу гэтага слова:

*Пасля вяселля Вераніка пераехала да Косціка, а недзе праз год Максім атрымаў ад яе пісьмо, поўнае бясконцай віны. Ён хацеў спаліць яго, але маці не дазволіла, сказала амаль жорстка: «Калі яна не чалавек, то будзь чалавекам ты, сынок. Дай ёй апраўдацца». Стала сорамна. Ён чытаў, і словы хвасталі, як крапіва. «Я спужалася». «Я не гатова была прыняць цябе ТАКІМ». «Я закахалася ў яго». А потым – нечаканае. «Я шкадую». «Я расчаравалася». «Ён і мезенца твайго не варты». Максім не верыў* (Нарэйка, с. 255).

Зварот да папярэдняга кантэксту дазваляе зразумець не толькі прычыну вылучэння слова, але і нежаданне дзяўчыны называць гэту прычыну: Вераніка не магла прыняць Максіма без нагі, але ёй сорамна і балюча за свой учынак, і яна не хоча лішні раз нагадваць хлопцу пра яго калецтва. У сувязі з адзначаным варта падкрэсліць, што напісанне асобных слоў вялікімі літарамі кампазіцыйна важнае.

Пры дапамозе вылучанага вялікімі літарамі слова аўтар можа перадаваць наступныя прагматычныя значэнні:

• надзвычайную змястоўнасць, выкліканую папярэднім ходам падзей:

*Дахаты ён прыйшоў позна, распрануўся... Праз нейкі час зайшоў на сваю паштовую скрыню і ўбачыў лічбу: 1. Ён не спяшаўся паглядзець, ад каго прыйшло гэтае паведамленне. Як мог адцягваў гэты момант. Каб была надзея... Ён быў упэўнены, што яна больш ужо не пажадае сустрэцца з ім.*

*«А навошта? Яна ўжо ўбачыла мяне ва ўсёй прыгажосці!»*

*Але ён не вытрымаў, націснуў на паведамленне і ўбачыў яе імя. У лісце быў усяго адзін толькі сказ: «Я проста хачу цябе ЎБАЧЫЦЬ...»* (Мартыновіч, с. 241).

Чытач можа толькі здагадвацца, ці было вылучана вялікімі літарамі слова ў паведамленні, аднак у значнасці зместу гэтага слова для хлопца сумнявацца не прыходзіцца: ён перажываў, што першае спатканне пайшло зусім не па плане, хваляванне перашкодзіла ажыццявіць задуманае, і вырашыў, што дзяўчына больш не захоча з ім сустракацца. Аднак змест паведамлення сказаў тое, пра што юнак нават баяўся марыць: увесь сэнс жыцця сканцэнтраваўся ў кароткім слове;

• максімальную рэалістычнасць карціны:

*З дзявятага паверха было шмат чаго відаць: пакрыты нясмелым позне-лістападаўскім снегам двор, у якім з-за шматлікіх машын не было дзе гуляць; рэдкія дрэвы і вароны на іх, а таксама суседні дом, на «сляпой» без вокнаў, сцяне якога – і як гэта маглі зрабіць? – было намалявана чорнай фарбай: «ЦОЙ ЖЫВЫ!!!»* (Пятровіч-2, с. 178);

• узмоцненасць інтрыгі:

*...дастаю з кайстры замацаваны ізалентай і скотчам вялікі папяровы пакунак і выводжу зверху вялікімі ладнымі літарамі: ГЕНІЯЛЬНЫ ТВОР, хоць ужо неяк друкаваўся ў раёнцы і мяне павінны былі ведаць, думаю здзівіць сціпласцю і дадаю: НЕВЯДОМАГА АЎТАРА, ніжэй акуратна пішу сваё прозвішча, назву мястэчка і дакладны адрас, куляй вылятаю з кустоў, кладу пакет на ганак, адпрацаваным ударам разы са тры гучна грукаю нагой у дзверы і бягу прэч ад рэдакцыі насустрач славе і вядомасці, і салодкаму-салодкаму, багатаму-багатаму, багемнаму-блін-перабагемнаму літаратурнаму жыццю – а што? я ж цяпер свой...* (Касцюкевіч-1, с. 326).

Манера запісу ўплывае на першаснае ўспрыманне зместу напісаных вялікімі літарамі слоў і, адпаведна, на стварэнне зацікаўленасці ў чытача: што гэта за геніяльны твор і хто з'яўляецца яго аўтарам? Пошук адказаў на гэтыя пытанні накіроўвае на прачытанне ўсяго твора, што, па сутнасці, і спрыяе рэалізацыі аўтарскай задумы.

Цікавымі ў прагматычных адносінах уяўляюцца выпадкі мастацкага аб'яднання слоў, напісаных з малой літары, слоў, напісаных з вялікай літары, і слоў, напісаных вялікімі літарамі. Такое аб'яднанне, несумненна, узмацняе прагматычную накіраванасць твора і можа адлюстроўваць наступныя прагматычныя значэнні:

• значнасць прадмета разважання, ідэнтычнасць аўтарскай і чытацкай пазіцыі:

*Навошта мы жадаем таго, што нам недадзена ніколі?*

*НІКОЛІ – гэтае слова можна напісаць вялікімі ці малымі літарамі, усё адно яно будзе самым страшным словам на зямлі. НІКОЛІ...* (Прохар-1, с. 35).

Аўтар не проста вылучае сэнс гэтага слова, а, акаймоўваючы кальцавой кампазіцыяй абзац, запрашае чытача паўторна асэнсаваць вылучаны фрагмент і пагадзіцца з аўтарскай пазіцыяй;

• значнасць учынкаў, дзеянняў, асоб:

*Для мараў падставы былі: рэдкая знешнасць, прыгожы голас, акардэон, без пяці хвілін медаль за школу...*

*Якую пяццю гадамі раней скончыў Ён – ужо майстар на адным з найбуйнейшых заводаў і студэнт-завочнік.*

<...>

*Ад гэтых непрыемных клопатаў* (пра яго здароўе. – *В. Ш.*) *ён яе вызваліў: моўчкі сабраў адзенне і з'ехаў.*

*Як не сшалела тады (ЯЕ (?!) кінулі. І хто?..)* (Доўнар-1, с. 54–55).

Ва ўсім апавяданні-мініяцюры сустракаюцца толькі два выпадкі ненарматыўнага напісання слоў. Лексема *Ён* ужываецца ў пачатку апавядання, калі прыгожы і перспектыўны юнак уяўляўся для капрызнай дзяўчыны адзіным і неабходным. Але паступова яго значнасць для жанчыны змяншаецца, каханне не вытрымлівае выпрабавання эгаізмам. У кароткім вылучаным слове *ЯЕ* перададзены змяненне акцэнтаў, абурэнне, недаўменне, прыніжэнне, крыўда і абсалютнае неразуменне ўласных памылак – таго, што ўрэшце прывяло да расставання;

• паступовасць, паслядоўнасць абагульнення, усведамлення, асэнсавання:

*«Я – адзін... Я – Адзін... Я – АДЗІН...» – Трэя ахоплівала ўсведамленне крытычнасці сітуацыі. А можа, ён увесь час ішоў да адзіноты?* (Нераток, с. 263).

Несістэмнае напісанне вялікай і малой літар указвае на змястоўнае і стылістычнае адрозненні паміж варыянтамі запісу. Слова *адзін*, напісанае з малой літары, успрымаецца як сцвярджэнне адзіноцтва (па сутнасці, яго значэнне ўспрымаецца як цалкам кантэкстуальна абумоўленае); першая вялікая літара ў слове *Адзін* затрымлівае ўвагу на гэтай лексеме, прываблівае патрэбай яе пераасэнсавання; напісанне слова *АДЗІН* вялікімі літарамі дазваляе меркаваць аб поўным усведамленні жахлівасці сітуацыі, у якую трапіў персанаж твора.

Наўмыснае выкарыстанне вялікай літары насуперак правілам часам суправаджаецца ненарматыўным напісаннем слова. Вылучэнне няправільна напісанай літары (літар) мае выразную прагматычную накіраванасць. Аўтар падкрэслівае памылку, узмацняючы ў чытача ўражанне ад атрыманага паведамлення:

*Мара дастала з кішэні нататку і разгарнула яе.*

*«З ДНЕМ НАЬАДЖЭННЯ!» – было напісана на пакамечанай паперцы рукой трынаццацігадовага хлопчыка, які не ўмеў чытаць, але сёння ўначы выратаваў Мару з агню* (Беланожка, с. 28).

Знарочыстым графіка-арфаграфічным парушэннем аўтар падкрэслівае высакароднасць хлопчыка, неверагоднасць яго ўчынку: хлопчык не толькі выратаваў Мару, але і, каб зрабіць ёй прыемнае, напісаў дзяўчыне віншаванне, хоць апошняе, як відаць, далося яму нават цяжэй, чым прыйсці на дапамогу.

Напісаныя вялікімі літарамі словы, словазлучэнні і сказы займаюць асобае месца ў структуры мастацкага тэксту. Іх прагматычная арыентаванасць, выкліканая нестандартнасцю ўжывання і нетыповасцю афармлення, накіравана на цесную ўзаемасувязь нават пры дыстантным ужыванні. Па сутнасці, прагматычна маркіраваныя адзінкі мастацкага тэксту асэнсоўваюцца як ключавыя, а прачытанне і інтэрпрэтацыю сказаў можна ўспрымаць як аснову, на якой будуецца і на якую «нарошчваецца» ўвесь твор. Прыклад такога сцвярджэння – апавяданне Г. Аўласенкі «Бо аракул ніколі не памыляецца», у якім вылучаныя сказы і сказы з вылучанымі словамі і словазлучэннямі ўспрымаюцца як падрабязны план апавядання, прагматычна накіроўваюцца на стварэнне ў адрасата асацыятыўнай сувязі паміж словамі і ўчынкамі. Нават вырваныя з агульнага тэксту апавядання, працытаваныя сказы даволі празрыста перадаюць яго завязку, кульмінацыю і развязку.

Сучасная беларуская проза адступае ад звычнай формы запісу. У пачатку сказаў, абзацаў, раздзелаў, глаў і нават цэлых твораў усё часцей выкарыстоўваецца малая літара, што, аднак, зусім не зніжае мастацкай вартасці твора: такім чынам аўтар дапамагае развіваць фантазію чытача, дазваляючы яму самастойна расставіць акцэнты, вылучыць істотнае і другаснае. Выразным пацвярджэннем дынамікі прагматычнага патэнцыялу малой літары можа стаць наступны прыклад:

*Гэтая жудасная жанчына ў чорным, яна...*

*...яна кінула ляльку ў ваду – і ў той жа вечар патануў нейкі, невядомы Віталю Руслан, які хадзіў да яе, а ў той дзень за нешта пабіў, і пабіў моцна...*

*...а ўчора яна калола другую ляльку іголкай, дакладней, яна біла ёй аб гэтую іголку... і Андрэй, які перад тым шпульнуў у сабаку цаглінай, загінуў так крыўдна і так недарэчна. І тым не менш загінуў ён у поўнай адпаведнасці з яе чараўніцтвам! Загінуў, паводле Міхася, нават не патрапіўшы ў сабаку...*

*...а вось сам Міхась патрапіў...*

*...і пашкодзіў сабаку лапу...*

*...і забінтаваная левая рука жанчыны...*

*...і трэцяя лялька паляцела ў вогнішча...*

*...і згарэла там...*

*Віталь азірнуўся і паглядзеў на Міхасёву хату, старую, спарахнелую амаль, з выразнай чорнай плямінай на адным з кутоў. Яна ўжо гарэла аднойчы... праўда, гэта здарылася днём, і пажар паспелі патушыць даволі хутка...* (Аўласенка-1, с. 140–141).

Такая форма запісу дапамагае выхопліваць з надзвычай усхваляванай, узбуджанай свядомасці персанажа асобныя больш ці менш завершаныя думкі і складаць іх у адзінае цэлае. Пазбягаючы традыцыйнага напісання, аўтар не толькі прэтэндуе на арыгінальнасць, але і мяркуе, што чытач убачыць і адчуе нявыказаны сэнс незвычайна пададзеных радкоў.

Ужыванне малой літары ў пачатку сказа або абзаца ўплывае на ўспрыманне непаўнаты пададзенай інфармацыі, яе адарванасці ад папярэдняга зместу, эпізадычнасці, схематычнасці, часовасці. Афармленае з малой літары паведамленне нібы страчвае сваю значнасць, выразнасць, магчымасць самастойнага існавання і пры гэтым захоўвае залежнасць ад папярэдняй часткі тэксту.

Для сучаснай мастацкай прозы характэрны наступныя прагматычныя значэнні малой літары:

• зварот не да ўсёй, а да кантэкстуальна значнай часткі чыйго-небудзь выказвання, думкі:

*Відаць, больш за ўсё мяне параніла адна фраза старога рэжысёра:*

*...гэта фільм пра каханне, раптам зразуметае залішне позна, калі ўжо нічога не вярнуць...*

*...калі нічога не вярнуць...*

*...калі ты ператвараешся ў графа Каліёстра. Чалавека, у якога ёсць усё, акрамя кахання. А значыць, няма самага каштоўнага...* (Прохар-2, с. 96–97).

Аўтар прыводзіць частку цытаты, якая найбольш уразіла яго, потым змяншае яе, пакінуўшы толькі тое, што найбольш хвалюе, вызначае ўвесь далейшы лёс персанажа. Чытач не можа праверыць дакладнасць зместу разарванай фразы старога рэжысёра, але верыць у значнасць яе сэнсу для таго, хто перажывае такія ж пачуцці. Але, відаць, аднолькавая толькі назва пачуццяў, сіла ж іх уздзеяння і ўражанняў у кожнага свая, непаўторная, адметная. Асобныя эпізоды сціраюцца, застаюцца ў памяці толькі самыя яркія моманты, а яшчэ спусташальнае адчуванне таго, што *нічога не вярнуць...* У гэтых адносінах адступленне ад традыцыйнай нормы афармлення простай мовы (у двукоссі, з вялікай літары) успрымаецца не як максімальна адпаведнае зместу, а як адзіна магчымае, паколькі дзякуючы ўзмоцненай экспрэсіі яно дакладна перадае імпліцытную насычанасць запісу;

• імкненне вярнуцца да рэальнасці:

*Увечары наступнага дня я зноў быў на працы. Мяне чакаў фільм.*

*Я стараўся думаць толькі пра яго, як пра сваю працу, і не згадваць учарашняга. Я ізноў гаварыў звыклыя фразы па тэксце:*

*...і іншыя...*

*...у фільме...*

*...Калі ласка, не пакідай мяне аднаго.*

*Не!*

*Не!*

*Nein!* (Прохар-2, с. 97).

Відавочна, што спалучэнне ненарматыўнай (з малой літары) і нарматыўнай (з вялікай літары) форм запісу дзеліць працытаваны ўрывак на дзве часткі: аўтар, паказваючы, што персанаж стараецца працаваць усвядомлена, нібы адмяжоўвае нязначныя, звыклыя, схематычныя выказванні накшталт *і іншыя*, *у фільме* ад таго, чым жыве яго душа, што турбуе сэрца (*Калі ласка, не пакідай мяне аднаго. Не! Не! Nein!*);

• працяг спыненай або перарванай размовы:

*– Вы падышлі да мяне толькі таму, што я вельмі жадаў гэтага. І ўвогуле, я...*

*У гэты час у пакоі загучала музыка.*

*– ...я запрашаю вас на танец. Гэта вальс?* (Аўласенка-2, с. 42);

• жаданне паправіць, удакладніць сказанае:

*Плошча каля крамы была ярка асветлена шматлікімі ліхтарамі і рэкламай, і таму дзяўчына з юнаком былі добра відаць. Але зусім не відаць было старога, які моўчкі пазіраў на іх з цемры старога парку.*

*«Гэта не яна! – зноў падумалася старому. – Так не бывае... не павінна быць! Я памыліўся, проста памыліўся!»* (Аўласенка-3, с. 62);

• адначасовае суіснаванне немагчымага:

*Так, гэта была яна... і ўсё ж такога не магло быць, ніяк не магло! Ён сам, пэўна, з'ехаў з глузду, стары дурань, вось і прыдумляе бог ведае што...* (Аўласенка-3, с. 62);

• супастаўленне дзеянняў, учынкаў:

*Але дзяўчына зноў засмяялася, звонка і знаёма. Потым, узняўшы руку, яна яшчэ больш знаёмым жэстам правяла па валасах чарговага свайго кавалера... а ў старога раптам балюча сціснула сэрца і на кароткае імгненне аж перахапіла дыханне. Ён нават сам крыху здзівіўся гэтай сваёй рэакцыі...* (Аўласенка-3, с. 62);

• далучэнне лагічна неаднародных кампанентаў (зеўгма):

*Чаго дамаглася?*

*У яго цяпер – нічога асаблівага (?!) – здароўе і новая сямейка (жонка, маленькі сын). У яе – шыкоўная трохпакаёўка ў цэнтры, машына, гараж, золата з брыльянтамі і... анкалагічна хворая дачка* (Доўнар-1, с. 54);

*Крама. Чарга каля касы. Наперадзе – двое. У яго – досыць груваcткі і поўны вазок з таварам, у яе – кашалёк і... проста напалеонаўскія планы...* (Доўнар-2, с. 4);

• нежаданне аўтара вылучаць галоўнае і другаснае:

*адзін адносна малады чалавек на прозвішча андруш валовіч апоўдні з'явіўся на плошчы правінцыйнага горада сярэдніх памераў. ён зверыўся з гадзіннікам. і з пачуццём узрастаючага дыскамфорту агледзеўся навокал. да сустрэчы з заказчыкам заставалася каля дзесяці хвілін. валовіч не збіраўся чакаць яго больш за дамоўлены час. а пакуль тое – «прабіў» людзей вакол сябе. і нядобра задумаўся* (Станкевіч, с. 50).

І ў працытаваным урыўку, і ва ўсёй аповесці аўтар адмаўляецца ад выкарыстання вялікай літары. Асэнсаванне рэальнасці як неразгаданай таямніцы не магло не накласці адбітак на спецыфічнае афармленне, прагматычная накіраванасць якога звязана з пошукам адказу на пытанне аб тым, што здарылася з дачкой невядомага мужчыны, які наняў Андруша Валовіча, каб звазіць яе да святара. Уся дапамога аўтара чытачу ў выбудоўванні сюжэтнай лініі зводзіцца да пунктуацыйнага афармлення твора. Высвятляць значнасць асоб і падзей, расстаўляць акцэнты і прыярытэты павінен толькі чытач, што і падкрэслівае аўтар, аддаючы перавагу малой літары;

• уключэнне аўтарскай заўвагі, неістотнай для ўдакладнення сэнсу, аднак важнай для стварэння ўражання рэальнай размовы:

– <...> *Часам прычына самагубства – татальнае ўздзеянне асяроддзя, дэспатыя маральная, розніца паміж сваім маральным ідэалам і бездухоўнасцю навакольных, страшэннае, безнадзейнае расчараванне ў жыцці, незаслужаны здзек, абраза асобы... часцей за ўсё бывае комплекс усіх гэтых праблем. Я ў маладосці студэнцкай нават пісаў работу ў навуковым гуртку, накшталт, здаецца, гэтага вось... як жа назва, дай бог памяці, а... вось...* (Марчук-1, с. 130).

Аўтар адмаўляецца ад нарматыўнага напісання з вялікай літары слоў пасля шматкроп'я, а разам з тым і ад вылучэння асобных сказаў як самастойных, незалежных адзінак, падкрэсліваючы такім чынам адзінства маўленчай плыні, лексіка-граматычных сувязей;

• вылучэнне важнай думкі сярод мноства магчымых, але не прыведзеных з прычыны сваёй уяўнай нязначнасці:

*

*...я ведаю, балюча будзе, бо зноў вяртаюся ў мінулае – іду завулкам Бранявым...*[6] (Касцюкевіч-3, с. 310).

Графічнае вылучэнне працытаванага абзаца, аддзяленне яго ад папярэдняга тэксту накіроўваюць на самастойнасць, значнасць і незалежнасць зместу, у той час як малая літара ў сукупнасці з шматкроп'ем указваюць на інфармацыю, свядома вырваную з нейкага не прыведзенага кантэксту, змест якога пры жаданні можа ўзнавіць чытач;

• указанне сэнсавага адзінства з папярэдне вылучанай інфармацыяй:

*Без цябе... свет падае душы сігналы трывогі, як званочак у тумане, сон – не радасць, дзень – адно доўгае, доўгае чаканне.* <...> *Без цябе... да галаўнога болю п'ю на кухні чай, шоргаю бессэнсоўна лыжкай па талерцы, чытаю толькі загалоўкі газетных артыкулаў.* <...>

*З табой... свет, што наўкола, як бы адсутнічае, паняцці смерць, небяспека, зло – не існуюць, час прыпыняецца, атмасфера горада сціскаецца да поля, якое толькі паміж намі.* <...> *Надвор'е толькі падкрэслівае ўзвышанасць настрою... нават лепш, калі сыпле дробны дождж... прыемна туліцца адно да аднаго пад парасонам. З табой... знікае стома, знікае пачуццё «вечнай мітусні», пачуццё невырашальных сумненняў, пакут ад уласнай бездапаможнасці ў гэтым неабсяжным свеце.* <...>

*Суцяшаюся... рукі ізноў разам, трымаемся за поручні ў тралейбусе* (Марчук-2, с. 385–386);

---

[6]Курсіў і афармленне аўтарскія.

• злучэнне або аб'яднанне сну і явы, нерэальнага і рэальнага:

*Мядзведзь зноў круціць галавой, пацешна, як у цырку, і цяжка дыхае. Не сумняваюся, што дыханне яго гніласнае і смярдзючае.*

*– Ну што ж, калі ты не адбіўся ад людзей, калі ты не ведаеш, куды шлях трымаеш – ідзі, я табе не ўказ. Пярэчыць не буду. Толькі дазволь пажадаць табе, вандроўнік...*

*Птушкі зноў заліліся самазабыўна – я падняў галаву ўверх і...*

*...прачнуўся ад чарговага званка.*

*– ...жадаю табе ўдачы, якая нібы сонейка, выгляне і прыемна здзівіць. Ты раптам убачыш усё ў новым святле. Удачы. Усё астатняе ў цябе ёсць, – міла закругліла Ларыса Барысаўна свой кароткі падрыхтаваны экспромт* (Андрэеў, с. 139–140).

Бар'ер паміж сном і явай настолькі невыразны, што рэальныя словы гучаць як працяг пачутых імяніннікам у сне. Гэта прагматычна падказваецца напісаннем малой літары;

• ілюстрацыя ўрыўкаў пачутых размоў:

*Галасы, галасы, галасы – аб чымсьці сваім, аб чымсьці...*

*...я такі фільм глядзеў!..*

*...не глядзі ў яе бок, што ты вылупіўся, як...*

*...сукенка, такая зялёненькая, прыгожая. Я проста паміраю...*

*...што ты бубніш на хаду, як...*

*...стары тралейбус. Трасецца... У мяне ў сумцы з вінаграду – каша...*

*...купім ім лепей цукеркі, яны танней, чым гэтае праклятае люстэрка, – працягвае абмеркаванне тая сямейная пара* (Прохар-2, с. 78).

Аўтар адмаўляецца ад прывычнага дыялагічнага афармлення, паколькі яно накіравала б чытача на ўспрыманне калектыўнай размовы. Едучы ў тралейбусе, персанаж выпадкова падслухоўвае гутаркі розных людзей. Афармленне асобных рэплік з малой літары ў сукупнасці са шматкроп'ем падкрэслівае іх вырванасць з кантэксту і раз'яднанасць.

## Заключэнне

Аналіз прагматычнага патэнцыялу графічнай арганізацыі мастацкага тэксту ўяўляецца надзвычай важным, таму што ўсе элементы графічнай сістэмы спрыяюць аб'яднанню структурных адзінак тэксту ў эмацыянальна-эстэтычныя інфармацыйныя блокі; указваюць на характар адносін паміж моўнымі сэнсавымі кампанентамі ў складзе блокаў; выступаюць спецыфічнымі маркерамі важных, змястоўных, імпліцытна насычаных пазіцый праз паказ вербальна не выражаных адносін аўтара да пададзенай ім інфармацыі. Аўтары мастацкіх твораў ужываюць розныя механізмы выкарыстання вялікай або малой літары, спрыяючы больш адэкватнаму прачытанню мастацкага тэксту, звужаючы (або, наадварот, пашыраючы) межы суб'ектыўнай чытацкай інтэрпрэтацыі.

На камунікатыўна-прагматычным узроўні выкарыстання вялікай або малой літары выражаюцца значэнні, абумоўленыя ўстаноўкай аўтара ў адносінах да зместу паведамлення і рэцыпіента. Імпліцытныя значэнні асобных пазіцый такога выкарыстання (слоў, напісаных з вялікай літары; слоў, напісаных вялікімі літарамі; словазлучэнняў і сказаў, напісаных вялікімі літарамі; ненарматыўнага ўжывання малой літары замест вялікай) могуць мець аднолькавы або блізкі прагматычны патэнцыял, аднак кожная з адзначаных пазіцый вылучаецца сваёй роллю ў якасці дадатковага сродку перадачы думак і пачуццяў, структурна-кампазіцыйнай арганізацыі твора, выражэння перспектыўна-рэтраспектыўных адносін.

Указаныя прагматычныя значэнні з'яўляюцца вынікам аналізу сучасных мастацкіх твораў і характарызуюцца як найбольш частотныя, тыповыя, аднак пералік гэтых значэнняў можа пашырацца, што абумоўліваецца індывідуальнасцю, прагматычнай накіраванасцю аўтарскай манеры выкарыстання графічных знакаў. Асобае графічнае афармленне дазваляе зашыфраваць аўтарскую інтэнцыю і дае магчымасць разнастайных інтэрпрэтацый, дзякуючы чаму прастора мастацкага тэксту аказваецца напоўненай безліччу сэнсаў і падтэкстаў, адначасова агульных для ўсіх чытачоў і адметных, індывідуальна асэнсаваных для кожнага паасобку.

## Скарачэнні

**Адам** – *Адам М.* Трыпціх // Скажы, што кахаю… / уклад. В. Шніп. Мінск : Маст. літ., 2018. С. 10–15 ; **Андрэеў** – *Андрэеў А.* Мядзведзь // Эфект лотаса. Мінск : Звязда, 2020. С. 133–149 ; **Аўласенка-1** – *Аўласенка Г.* Вядзьмарка // Ключ, які нічога не адмыкае. Мінск : Маст. літ., 2014. С. 130–141 ; **Аўласенка-2** – *Аўласенка Г.* Ты сама выбрала свой лёс // Ключ, які нічога не адмыкае. Мінск : Маст. літ., 2014. С. 38–43 ; **Аўласенка-3** – *Аўласенка Г.* Сустрэча // Ключ, які нічога не адмыкае. Мінск : Маст. літ., 2014. С. 60–66 ; **Беланожка** – *Беланожка А.* Паштоўка // Белы танец / уклад. А. Мацієўскі. Мінск : Маст. літ., 2016. С. 17–28 ; **Брава** – *Брава А.* Дараванне // Дараванне = Прощение = Vergebung. Мінск : Звязда, 2013. С. 7–64 ; **Доўнар-1** – *Доўнар В.* Ён і яна // Каб сказаць… І пачулі. Мінск : Харвест, 2012. С. 54–55 ; **Доўнар-2** – *Доўнар В.* Жыццё! // Каб сказаць… І пачулі.

Мінск : Харвест, 2012. С. 4 ; **Канстанцінава** – *Канстанцінава Н.* Не ведаю, калі вясна настане // Скажы, што кахаю… / уклад. В. Шніп. Мінск : Маст. літ., 2018. С. 154–162 ; **Касцюкевіч-1** – *Касцюкевіч М.* Рызыка: маналог // Колеры. М. : Рус. путь, 2013. С. 322–327 ; **Касцюкевіч-2** – *Касцюкевіч М.* Прысмеркі вялікага горада // Колеры. М. : Рус. путь, 2013. С. 164–165 ; **Касцюкевіч-3** – *Касцюкевіч М.* Аповед без героя // Колеры. М. : Рус. путь, 2013. С. 304–310 ; **Кебіч** – *Кебіч Л.* Дзень першага снегу // Скажы, што кахаю… / уклад. В. Шніп. Мінск : Маст. літ., 2018. С. 163–171 ; **Крэйдзіч** – *Крэйдзіч А.* Фантазія на тэму кахання // Скажы, што кахаю… / уклад. В. Шніп. Мінск : Маст. літ., 2018. С. 175–176 ; **Ліпскі-1** – *Ліпскі У.* Спадзяюся – не спадзяюся // Каранацыя душы. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2021. С. 13–19 ; **Ліпскі-2** – *Ліпскі У.* Веру – не веру // Каранацыя душы. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2021. С. 29–37 ; **Мартыновіч** – *Мартыновіч Я.* Я проста хачу цябе ЎБАЧЫЦЬ… // Скажы, што кахаю… / уклад. В. Шніп. Мінск : Маст. літ., 2018. С. 239–241 ; **Марчук-1** – *Марчук Г.* Кветкі правінцыі // Раман. Навелы. Каноны. Мінск : Маст. літ., 2022. С. 7–321 ; **Марчук-2** – *Марчук Г.* Ліст да каханай // Раман. Навелы. Каноны. Мінск : Маст. літ., 2022. С. 385–387 ; **Нарэйка** – *Нарэйка Н.* Скажы, што кахаю… // Скажы, што кахаю… / уклад. В. Шніп. Мінск : Маст. літ., 2018. С. 252–255 ; **Нераток** – *Нераток Ю.* Планета раслін // Цвёрды арэшак / уклад. А. Масла. Мінск : Маст. літ., 2013. С. 260–280 ; **Прохар-1** – *Прохар М.* Восень у Вільнюсе // Восень у Вільнюсе. Мінск : Маст. літ., 2014. С. 7–50 ; **Прохар-2** – *Прохар М.* Назіральнік // Восень у Вільнюсе. Мінск : Маст. літ., 2014. С. 55–110 ; **Пятровіч-1** – *Пятровіч Д.* Мара // Белы танец / уклад. А. Маціеўскі. Мінск : Маст. літ., 2016. С. 169–172 ; **Пятровіч-2** – *Пятровіч Д.* Выстава // Белы танец / уклад. А. Маціеўскі. Мінск : Маст. літ., 2016. С. 178–190 ; **Станкевіч** – *Станкевіч Ю.* Шал. Мінск : Галіяфы, 2012. 318 с. ; **Шамякін** – *Шамякін І.* Крывінка // Збор твораў. Т. 5. Мінск : Маст. літ., 2004. С. 371–446.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Арнольд ИВ. Графические стилистические средства. *Иностранные языки в школе*. 1973;3:13–20.
2. Зырянова ИП. Прагматическая интерпретация графических средств в художественном тексте. *Вестник Курганского государственного университета*. 2019;3:28–31. EDN: NTGTPX.
3. Дунёв АИ. Динамика орфографической нормы: прописная и строчная буква в современной письменной речи. *Universum: Вестник Герценовского университета*. 2007;12:36–40. EDN: NWZRLL.
4. Карпович МИ. Прописная буква как оружие в руках рекламиста. *Вестник Тверского государственного университета. Серия: Филология*. 2011;1:166–170. EDN: NZAKBF.
5. Маслова ВА. Параметры экспрессивности текста. В: Телия ВН, редактор. *Человеческий фактор в языке: языковые механизмы экспрессивности*. Москва: Наука; 1991. с. 179–204. EDN: ZCUYVR.
6. Бархударов ЛС. *Язык и перевод. Вопросы общей и частной теории перевода.* Москва: Международные отношения; 1975. 240 с.

## References

1. Arnol’d IV. [Graphic stylistic means]. *Inostrannye yazyki v shkole*. 1993;3:13–20. Russian.
2. Zyryanova IP. Pragmatic interpretation of graphic means in literary text. *Vestnik Kurganskogo gosudarstvennogo universiteta*. 2019;3:28–31. Russian. EDN: NTGTPX.
3. Dunyov AI. [Dynamics of the spelling norm: capital and lowercase letter in modern written speech]. *Universum: Vestnik Gertsenovskogo universiteta*. 2007;12:36–40. Russian. EDN: NWZRLL.
4. Karpovich MI. A capital letter as a weapon in the hands of adman. *Vestnik Tverskogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya: Filologiya*. 2011;1:166–170. Russian. EDN: NZAKBF.
5. Maslova VA. [Text expressiveness parameters]. In: Teliya VN, editor. *Chelovecheskii faktor v yazyke: yazykovye mekhanizmy ekspressivnosti* [The human factor in language: linguistic mechanisms of expressiveness]. Moscow: Nauka; 1991. p. 179–204. Russian. EDN: ZCUYVR.
6. Barkhudarov LS. *Yazyk i perevod. Voprosy obshchei i chastnoi teorii perevoda* [Language and translation. Issues of general and particular theory of translation]. Moscow: Mezhdunarodnye otnosheniya; 1975. 240 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 09.11.2023.*
*Received by editorial board 09.11.2023.*